**УДК 94(476)«1921–1939»**

# СТАЎЛЕННЕ ПРЫХІЛЬНІКАЎ НЕАУНІІ ДА ПРАДСТАЎНІКОЎ ІНШЫХ КАНФЕСІЙ У МІЖВАЕННЫ ЧАС (ПАВОДЛЕ ВЫДАННЯ «ДА ЗЛУЧЭНЬНЯ!»)

*Булатая В. Ю.*
Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы
Мінск, Беларусь

***Анатацыя.*** *Артыкул прысвечаны аналізу матэрыялаў часопіса «Да Злучэньня!», якія выдаваўся уніяцкім рухам у міжваенны час на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Даследаванне скіравана на вызначэнне пазіцыі, якой прытрымліваліся прыхільнікі неауніі ў дачыненні да прадстаўнікоў іншых хрысціянскіх канфесій – рыма-каталікоў, праваслаўных, пратэстантаў. Вынікі даследавання паказалі, што стаўленне выдаўцоў часопіса да афіцыйных царкоўных структур і звычайных вернікаў істотна адрознівалася. Вызначана: стаўленне прыхільнікаў неауніі да іншых канфесій узаемазвязана з мэтамі самога рэлігійнага аб'яднання.*

***Ключавыя словы:*** *Заходняя Беларусь; неаунія; міжканфесійныя адносіны; міжваенная прэса; часопіс «Да Злучэньня!»; езуіты; уніяты; праваслаўе; каталіцызм; пратэстантызм.*

# THE ATTITUDE OF SUPPORTERS OF NEOUNIA TOWARDS REPRESENTATIVES OF OTHER FAITHS IN THE INTERWAR PERIOD (ACCORDING TO THE PUBLICATION «DA ZLUČEŃNIA!»)

*Bulataya V. Y.*
Republican Institute of Higher Education
Minsk, Belarus

***Annotation.*** *The article analyzes materials from the magazine «Da Zlučeńnia!» published by the Uniate movement in Western Belarus during the interwar period. The study aims to determine the position held by proponents of the neo-union regarding representatives of other Christian denominations: Roman Catholics, Orthodox Christians, and Protestants. The results indicate a significant difference in the magazine publishers' attitude towards official church structures and ordinary believers. The study concludes that the neo-union supporters' attitude towards other denominations was interconnected with the religious union's goals.*

***Keywords:*** *Western Belarus; neo-union; interfaith relations; interwar press; magazine «Da Zlučeńnia!»; Jesuits; Church Union; Orthodoxy; Catholicism; Protestantism.*

У міжваенны час на тэрыторыі Заходняй Беларусі адбываўся адметны канфесійны працэс – адраджэнне Царкоўнай уніі. Канцэптуальна

прыхільнікі неауніі лічылі свой праект паслядоўным працягам ідэй Берасцейскай уніі, а іх актуальнай мэтай з'яўлялася распаўсюджванне ідэі рэлігійнага аб'яднання хрысціян Заходняй Беларусі.

Новая Царкоўная унія распаўсюджвалася пры падтрымцы Усходняй місіі айцоў-езуітаў. Дзеля распаўсюджвання яго ідэй актывісты выдавалі часопіс «Да Злучэньня!». Трэба адзначыць, што гэта быў адзіны беларускамоўны уніяцкі часопіс, які выходзіў пад патранажам езуіцкай місіі. Рэдактарам часопіса быў святар Антон Неманцэвіч (1893–1943), ён жа з'яўляўся і аўтарам шматлікіх артыкулаў часопіса. Перыядычнасць выхаду нумароў «Да Злучэньня!» – раз на месяц. З 1932 па 1937 г. пабачыла свет 30 нумароў выдання. У 1937 г. выхад часопіса быў спынены ў сувязі з забаронай яго выдання польскімі ўладамі [1, с. 436]. Аднак у 1938 г. часопіс быў рэарганізаваны ў новы пад назвай «Złučeńnie». Выходзіў ён у Варшаве (вядома пра 11 нумароў).

Паводле выдаўцоў, мэта распаўсюджання іх друкаванага органа перакрыжоўвалася з мэтай усяго уніінага руху і гэта – «справа рэлігійнага злучэньня Беларускага народу» [2, с. 3]. У гэтым палягала адметнасць часопіса «Да Злучэньня!» на фоне іншых беларускамоўных выданняў канфесійнай арыентацыі. Актывісты каталіцкіх і праваслаўных палітычных рухаў на старонках прэсы прапаноўвалі найперш ідэю нацыянальнага і палітычнага злучэння беларусаў розных канфесій пад дахам Апостальскай сталіцы [3, с. 10]. Уніяты лічылі, што грамадская і палітычная кансалідацыя – другасныя рэчы, якія выцякалі менавіта з рэлігійнага злучэння [4, с. 13].

Варта адзначыць, што неаунія на землях Заходняй Беларусі распаўсюджвалася ва ўмовах міжканфесійнасці. З той прычыны, што дзейнасць уніятаў галоўным чынам была скіраваная на «канфесійнае перавыхаванне» праваслаўных жыхароў, а апорай уніі ў Заходняй Беларусі былі менавіта беларусы-каталікі, нашчадкі колішніх уніятаў [5, с. 120], аўдыторыя часопіса была дастаткова шматпластавай.

Такім чынам, можна вылучыць дзве важныя асаблівасці выдання адзінага беларускамоўнага друкаванага органа уніятаў:

1) імкненне да рэлігійнага яднання беларусаў розных канфесій;

2) дзеянне ва ўмовах шматканфесійнасці.

У адпаведнасці са сваім галоўным пастулатам і безапеляцыйнымі ўмовамі аб'яднання, якое было магчымым толькі пад дахам Апостальскай сталіцы, прыхільнікі новай уніі фарміравалі і трансліравалі праз часопіс «Да Злучэньня!» сваё стаўленне да прадстаўнікоў іншых кан-

фесій. Улічваючы акрэсленыя акалічнасці, важнай даследчай задачай з'яўляецца ахарактарызаваць гэтае стаўленне.

Аналіз зместу артыкулаў часопіса «Да Злучэньня!» дазволіў сфарміраваць наступныя глабальныя вектары стаўлення ўніятаў да прадстаўнікоў іншых канфесій:

1) «уніяты – рыма-каталікі»;

2) «уніяты – праваслаўныя»;

3) «уніяты – пратэстанты».

**Пазіцыя па вектары «ўніяты – рыма-каталікі».**

Відавочна, што прыхільнікі неауніі спрыяльна ставіліся да рыма-каталікоў. Пра гэта сведчыла найперш самаідэнтыфікацыя ўніятаў на старонках часопіса, якая акрэслівалася наступным чынам: «…мы каталікі не лаціискага, а ўсходняга абраду» [6, с. 5] або «я веры грэка-каталіцкай» [7, с. 3]. Лучнасць з рыма-каталікамі праяўлялася ў наступных сферах:

1) матэрыялах часопіса, дзе асвятляліся сумесныя з рыма-каталіцкім духавенствам канферэнцыі, мерапрыемствы і з'езды [3, с. 4; 8, с. 4; 9, с. 3; 10, с. 10; 11, с. 9];

2) публікацыях на старонках часопіса артыкулаў такіх рыма-каталіцкіх святароў, як Я. Рэшаць [12, с. 6], П. Татарыновіч [8, с. 2–3], Я. Германовіч [13, с. 8; 14, с. 6] і інш., якія падтрымлівалі праект новай уніі;

3) папулярызацыі беларускага каталіцкага часопіса «Chryścijanskaja Dúmka», выдаўцом якога быў рыма-каталіцкі святар А. Станкевіч [2. с. 17].

Прыязнае стаўленне да рыма-каталіцтва ў цэлым абумоўлена тым. што фактычна праект новай уніі з'яўляўся часткай агульнай канфесійнай палітыкі, якую праводзіў і рэалізоўваў Ватыкан. Прыхільнікі неауніі на старонках часопіса трансліравалі безапеляцыйную праграмную пазіцыю: злучэнне хрысціян магчыма толькі пры ўмове падпарадкавання Папе Рымскаму [2, с. 4; 8, с. 17; 14, с. 4; 15, с. 9]. Варта акрэсліць, што такая ўмова для аб'яднання абумоўлена яшчэ і каштоўнасцямі ордэна езуітаў, адметнасцю якога было праяўленне поўнага паслухмянства Папе Рымскаму [13, с. 11].

Аднак пры ўсім гэтым заўважаецца парадокс. Як у польскамоўнай. так і ў беларускамоўнай каталіцкай прэсе праект неауніі актыўна крытыкаваўся. Крытыкавалі неаунію ў тым ліку і беларускія каталіцкія дзеячы, якія называлі праект «няшчырым» для Беларусі [16–18]. Часопіс «Да Злучэньня!» востра не рэагаваў на крытыку ад рыма-каталікоў у свой адрас, аднак каштоўнасці ўнійнагай праекта адстойваў, між

іншым выкарыстоўваў закіды рыма-каталікоў у свой бок, каб тлумачыць чытачам розніцу паміж грэка- і рыма-каталіцтвам [6, с. 6].

**Пазіцыя па вектары «уніяты – праваслаўныя».**

На старонках часопіса «Да Злучэньня!» стаўленне да праваслаўя ў цэлым не было пазітыўным. Прыхільнікі неауніі адмоўна ставіліся да падзелу адзінай царквы 1054 г. і лічылі, што унія – добрая магчымасць для таго, каб праваслаўе вярнулася ў лона Адзінай Царквы. Стаўленне прыхільнікаў уніі да праваслаўя палягала ў дзвюх вялікіх плоскасцях:

1) агульнае стаўленне да канфесіі і праваслаўных царкоўных структур на тэрыторыі Польшчы;

2) стаўленне да праваслаўных вернікаў.

У часопісе «Да Злучэньня!» рэгулярна выходзілі артыкулы на багаслоўскую тэматыку, дзе аўтары ставілі за мэту паказаць перавагу вучэння каталіцкай царквы над праваслаўнай [7, с. 2; 9, с. 1; 14, с. 1]. У артыкулах, па сутнасці, усё зводзілася да таго, што праваслаўе – штучна створаная канфесія, а «праўдзівае праваслаўе – унія з Апостальскім Пасадам» [7, с. 2].

Прыхільнікі неауніі лічылі, што праваслаўе як канфесія знаходзілася ў маральным крызісе, бо клапацілася пра знешнія рэчы замест унутранага духоўнага жыцця вернікаў [12, с. 16]. Адзначалася, што за апошнія стагоддзі праваслаўе на тэрыторыі Беларусі аслабла, таму не магло супрацьстаяць уплыву «розных сэктаў» [12, с. 9].

Прыхільнікі неауніі выступалі з крытыкай і афіцыйных структур праваслаўнай царквы – Польскай Праваслаўнай аўтакефальнай царквы. Крытыкаваліся і іерархі (аўтары называлі іх «самагаловымі епіскапамі» [2, с. 10; 20, с. 5], і сама па сабе ідэя аўтакефаліі. Вялікую негатыўную ацэнку атрымала ПАПЦ праз супрацоўніцтва з Англіканскай царквой. У матэрыялах часопіса аўтары крытыкавалі як сам саюз праваслаўных з пратэстантамі, так і магчымасць вучобы багаслоўя ў Лондане для праваслаўных святароў [15, с. 9].

На працягу ўсяго выхаду часопіса уніяты называлі звычайных праваслаўных вернікаў «нязлучанымі» і прадстаўлялі сябе тымі, хто ўсклаў на сябе місію злучыць хрысціян пасля расколу 1054 г. у адну царкву. Сябе ж уніяты называлі праваслаўнымі «злучанымі».

У часопісе публікаваліся матэрыялы, з якіх можна зрабіць выснову, што паміж неаўніятамі і праваслаўнымі вернікамі ішлі прыватныя гутаркі, накіраваныя на тое, каб данесці ідэю уніі да апошніх [12, с. 6]. Так, унійныя дзеячы былі перакананы, што звычайнае праваслаўнае насельніцтва было падманутае і няправільна разумела сэнс уніі: «Кожны.

хто прыймае Сьв. Унію, хай ведае, што выракаецца хвальшывага сучаснага праваслаўя» [7, с. 4]. Таксама даносілі думку, што сапраўднае праваслаўе магло існаваць толькі з Папам Рымскім [2, с. 4; 8, с. 17; 14, с. 4; 19, с. 13].

Трэба меркаваць, што значнай часткай мэтавай аўдыторыі часопіса былі звычайныя праваслаўныя вернікі, да якіх стаўленне было хутчэй паблажлівае, чым грэблівае. На нашу думку, пацвярджае гэта моўны зварот, які выкарыстоўваўся ў шматлікіх публікацыях: «Браты нязлучаныя праваслаўныя» [7, с. 2; 8, с. 10; 9, с. 16].

**Пазіцыя па вектары «ўніяты – пратэстанты».**

Стаўленне прыхільнікаў неауніі да пратэстанцкага насельніцтва можна разгледзець па дзвюх лініях:

1) стаўленне да пратэстантызму як да з'явы, якая распаўсюджвалася сярод беларусаў;

2) стаўленне да звычайных пратэстантаў, колькасць якіх у Заходняй Беларусі павялічвалася [21, с. 46].

Пазіцыя ўніятаў адносна далучэння да пратэстантызму была простая і вызначалася найперш дагматычным канфліктам. Прыхільнікі неауніі наогул не ўспрымалі пратэстантызм як хрысціянскую канфесію [22, с. 12]. З гэтай прычыны публікаваліся артыкулы багаслоўскага і дагматычнага характару.

На старонках «Да Злучэньня!» розныя галіны пратэстантызму называліся «сэктамі», усе яго плыні лічыліся ворагамі, якія перашкаджалі злучэнню хрысціян, якога хацелі дасягнуць уніяты: «Усе сэктанскія групы, як напрыклад: пяцідзясятнікі, баптысты, мэтадысты і г. д. зьяўляюцца перашкодай да хрысьціянскага адзінства» [9, с. 10].

Між іншым у артыкулах фіксаваліся звесткі, што пратэстанты рабілі крытычныя закіды ў бок уніятаў, на што часопіс рэагаваў: публікаваліся артыкула на дагматычныя і багаслоўскія тэмы. Гэта дае падставы сцвярджаць, што паміж уніятамі і пратэстантамі вялася своеасаблівая палеміка [8].

Істотны момант у агульнай пазіцыі часопіса «Да Злучэньня!» да пратэстантаў – стаўленне да звычайных вернікаў. Рэдактар часопіса А. Неманцэвіч заклікаў аддзяляць пратэстантызм як з'яву грахоўную ад простых людзей. Хоць пратэстанты і называліся «сэктантамі», але лічылася, што ўсе, хто быў далучаны да іх, заблукалі: «Браты хрысьціяне, заблудзіўшыя ў розных сэктах і адшчапленьнях, шукайце праўды, імкніцеся да злучэньня, а Госпад Бог нам паможа і вызваліць нас ад усякага сумніву і духоўнага неспакою» [3, с. 11]. А. Неманцэвіч

заклікаў звярнуць на пратэстантаў асаблівую ўвагу, гутарыць з імі. каб данесці, што толькі каталіцкая царква з'яўлялася сапраўднай. Пры гэтым на старонках часопіса трансліравалася, што шмат пратэстантаў ужо зразумелі памылковасць свайго канфесійнага выбару, а каталікам давалася настаўленне: «Трэба прымаць тых, хто ашукаўся, трэба пахваліць, што пакінуў сэктантаў і вярнуўся да праўдзівае Хрыстовае веры» [23, с. 3]. Пры гэтым ён спасылаўся на ўласны добры прыклад узаемадзеяння з баптыстамі [23, с. 3].

У прыватнасці, у тэкстах часопіса былі прыведзены выпадкі, калі пратэстантаў атрымлівалася далучыць да уніі [23, с. 4]. Адзначалася. што «па прычыне агульнага крызісу, вельмі зьменьшылася матар'яльная помач Амэрыкі для справы пашырэньня ў нас сэктанства, дзеля гэтага сэкстанства ў нашай старонцы ўжо не пашыраецца, а памалу вымірае» [23, с. 3].

Такім чынам, стаўленне да іншых канфесій, якое трансліравалася на старонках часопіса «Да Злучэньня!» прыхільпікамі неауніі, сыходзіла з мэты распаўсюджання самой уніі, а менавіта злучэння хрысціян пад апекай Рымскага Папы ў лоне каталіцкай царквы з усходнім абрадам. Адпаведна, той, хто не падтрымліваў ідэю такога злучэння, аўтаматычна трапляў пад разнастайную крытыку аўтараў часопіса. Калі сыходзіць з трох вылучаных вектараў стаўлення прыхільнікаў новай уніі да прадстаўнікоў іншых канфесій, то можна акрэсліць наступныя пазіцыі:

1) стаўленне да рыма-каталікоў было цалкам станоўчым, што абумоўлена праграмнымі тэзісамі праекта адраджэння уніі. Аднак варта ўлічваць, што з боку рыма-каталіцкага насельніцтва, касцельных рухаў і прэсы стаўленне да новай уніі было неадназначным, часам негатыўным. Гэта абумовіла з'яўленне палемічных артыкулаў на старонках «Да Злучэньня!» у адрас рыма-каталікоў;

2) стаўленне да праваслаўных праяўлялася на розных узроўнях. Сама праваслаўная канфесія крытыкавалася на ўзроўні багаслоўскай і дагматычнай дыскусіі, афіцыйныя структуры Польскай Праваслаўнай аўтакефальнай царквы мелі негатыўную ацэнку дзейнасці з боку ўніятаў. Стаўленне ж да праваслаўных вернікаў было іншым: яны не падпадалі пад вострую крытыку, а разглядаліся як перспектыўная будучая паства для новай уніі;

3) стаўленне да пратэстантаў было ў пэўным сэнсе варожым: яны разглядаліся як перашкода для уніі. У матэрыялах «Да Злучэньня!» крытыкавалася пратэстанцкае багаслоўе і дагматыка, асуджалася дзейнасць пратэстанцкіх аб'яднанняў на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

Аднак да звычайных вернікаў пратэстанцкіх плыняў стаўленне было паблажлівым, яны разглядаліся як перспектыўнае поле для місіянерскай дзейнасці з мэтай іх вяртання.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Туронак, Ю.* Спробы адраджэння Уніяцкай царквы на Беларусі ў XX стагоддзі / Ю. Туронак // Мадэрная гісторыя Беларусі / Ю. Туронак. – Вільня: Ін-т беларусістыкі, 2008. – С. 430–449.
2. Да Злучэньня! – 1932. – № 1.
3. Да Злучэньня! – 1932. – № 9.
4. Да Злучэньня! – 1932. – № 11.
5. *Загідулін, А. М.* Беларускае пытанне ў польскай нацыянальнай і канфесійнай палітыцы ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А. М. Загідулін. – Гродна: ГрДУ, 2010. – 183 с.
6. Да Злучэньня! – 1938. – № 9.
7. Да Злучэньня! – 1935. – № 3.
8. Да Злучэньня! – 1932. – № 4–5.
9. Да Злучэньня! – 1932. – № 10.
10. Да Злучэньня! – 1932. – № 12.
11. Да Злучэньня! – 1936. – № 1–2.
12. Да Злучэньня! – 1932. – № 3.
13. Да Злучэньня! – 1934. – № 11.
14. Да Злучэньня! – 1934. – № 12.
15. Да Злучэньня! – 1932. – № 2.
16. Białoruskaja Krynica. – 1927. – № 34.
17. Białoruskaja Krynica. – 1931. – № 34.
18. Białoruskaja Krynica. – 1931. – № 17.
19. Да Злучэньня! – 1932. – № 7–8.
20. Да Злучэньня! – 1934. – № 2.
21. *Лисовская, Т. В.* Поздний протестантизм в Западной Беларуси (1921–1939 гг.) / Т. В. Лисовская. – Брест: Альтернатива, 2021. – 224 с.
22. Да Злучэньня! – 1934. – № 7–8.
23. Да Злучэньня! – 1935. – № 2.